# У БУДУЧЫНЮ

## плануюць прыняць 85,5 % беларусаў

Ці лічыце вы неабходным развіваць супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь **У НАСТУПНЫХ СФЕРАХ ЖЫЦЦЯ?**




У Рэспубліцы Беларусь даследаванне праводзілася Цэнтрам сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ метадам пакватэрнага інтэрв'ю (выбарка — 1500 рэспандэнтаў), у Сербіі — Інстытутам міжнароднай палітыкі і эканомікі (ІМПЭ) метадам тэлефоннага інтэрв'ю (выбарка — 1590 рэспандэнтаў). Даследаванні праводзіліся па падобнай методыцы, што дазваляе правесці параўнальны аналіз даных.

© Інфаграфіка БЕЛТА

У прыватнасці, сербы лічаць найбольш перспектыўнымі кірункамі супрацоўніцтва з Беларуссю сельскую гаспадарку, прадукты харчавання, гандаль. Такія даныя сацыялагічнага даследавання агучыў старшы навуковы супрацоўнік, дырэктар Цэнтра еўразійскіх даследаванняў Інстытута міжнароднай палітыкі і эканомікі Сербіі Душан Пракаравіч.

Перспектыўным у вачах сербаў бачыцца развіццё доўгатэрміновых адносін паміж Сербіяй і Беларуссю, асабліва ў сферы сельскай гаспадаркі і харчавання (51,3 %), гандлю (28,6 %) і машынабудавання (26,6 %). У рамках эканамічных адносін сербы падкрэсліваюць значнасць развіцця гандлю і больш шырокай прадстаўленасці прадукцыі абедзвюх краін на рынках Беларусі і Сербіі. У ліку найбольш вядомых беларускіх брэндаў названы лідары машынабудавання (МАЗ, МТЗ), флагманы бытавой тэхнікі («Атлант», «Гефест»), вытворцы касметычных сродкаў («Беліта») і кандытарскіх вырабаў («Камунарка»).

Характэрна, што санкцыйны ціск Захаду, які аказваецца на Беларусь, не ўплывае на ўспрыманне сербамі Беларусі як стратэгічна значнага партнёра. Прыярытэтнымі кірункамі развіцця супрацоўніцтва ў сацыяльнай сферы, на думку сербаў, выступаюць адукацыя, турызм, культура і рэлігія.

Сербы таксама лічаць неабходным развіццё супрацоўніцтва з Беларуссю ў такіх сферах, як вытворчасць (80,9 %), адукацыя і навука (78,7 %), гандлёва-эканамічная сфера (77,8 %), турызм (70,2 %), культура (67,3 %), грамадства (64,1 %), рэлігія (56,4 %), сфера фінансаў (40,1 %).

— Было вельмі цікава ўбачыць, што наша грамадства думае пра Беларусь. Для мяне самае важнае, што гэта першы крок для наступных даследаванняў. Нам трэба падумаць не толькі на палітычным, але і на навуковым узроўні, як дасягнуць прагрэсу, развіцця двухбаковых адносін з дружалюбнымі дзяржавамі. Беларусь тут — на першай лініі. І першы крок — гэта даследаванне, — расказаў Душан Пракаравіч. — Наша грамадства падтрымлівае супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь. Сербія можа быць акном для беларускай прадукцыі ў Еўрасаюз з-за дагавораў, якія ў нас існуюць з ЕС. А Беларусь можа быць акном для нашай вытворчасці ў ЕАЭС. Прастора для супрацоўніцтва шырокая. Можна рабіць сумесныя праекты ў эканоміцы. У Сербіі добра працуюць вашы МАЗы, БЕЛАЗы. У Сербіі ведаюць, што Беларусь — гэта аграіндустрыяльная сіла. У вас вельмі моцны аграпрамысловы комплекс. А развіццё сферы турызму дапаможа нам больш даведацца адзін пра аднаго.

### КРАІНА З ВЫСОКІМ ЧАЛАВЕЧЫМ КАПІТАЛАМ

Таксама ў рэспандэнтаў цікавіліся: якія перавагі Беларусі ствараюць аснову для ўзаемадзеяння з Сербіяй і іншымі славянскімі краінамі? Беларусь — краіна з высокім чалавечым патэнцыялам — так адказалі 43,5 % апытаных, Беларусь — экалагічна чыстая краіна — 41,5 %, Беларусь — аграрная краіна з сельскай культурай — 35,5 %, Беларусь — надзейны саюзнік і партнёр на міжнароднай арэне — 31 %, Беларусь — мост паміж цывілізацыямі, Захадам і Усходам — 29,8 %, Беларусь — міжнародная перагаворная пляцоўка — 22,5 %, Беларусь — донар міру і стабільнасці ў рэгіёне — 21,9 %, Беларусь — дзяржава сацыяльнай справядлівасці — 21,1 %.

— У час даследавання мы замяралі пазіцыю беларусаў у адносінах не толькі да сербаў, але і да сябе. І тут выявіліся некаторыя адрозненні.

> **«Калі сербы гавораць, што Беларусь — больш аграпрамысловая краіна, то самі беларусы лічаць, што гэта краіна з высокім чалавечым патэнцыялам. Гэта вельмі добрая пазіцыя, якая знаходзіцца на першым месцы. Другая па значнасці пазіцыя — экалагічна чыстая краіна. І далей ужо ідзе сельскагаспадарчая вытворчасць як важны складнік краіны. Гэтыя даныя сведчаць аб тым, што мы сябе ўспрымаем больш глыбінна», — адзначыла Ірына Лашук.**

Яшчэ адно пытанне, што ў час даследавання было зададзена беларусам і сербам: «У якіх сферах неабходна развіваць супрацоўніцтва Беларусі і Сербіі?»

— І падобныя атрымаліся вынікі, што таксама сведчыць аб нашых агульных інтарэсах. Гэта ў першую чаргу вытворчасць, адукацыя і навука, гандлёва-эканамічная і турыстычная сферы, што вельмі актуальна ва ўмовах санкцый. Турызм развіваецца ў бок дружалюбных нам краін, гэта лагічна. І мы маем тут вельмі сур'ёзныя рэсурсы адзін для аднаго, — падкрэсліла эксперт.

Яна лічыць, што гэта параўнальнае даследаванне — першы крок у навуковым асэнсаванні масавай свядомасці беларусаў і сербаў.

— І далей у гэтым кірунку трэба развівацца, тут ёсць вялікія перспектывы, — адзначыла Ірына Лашук.

Развіццё адносін з дружалюбнымі дзяржавамі патрабуе пастаяннага ўліку грамадскай думкі і запатрабаванняў. Адзін са спосабаў — правядзенне сустрэчных даследаванняў: два сацыялагічныя цэнтры адначасова арганізуюць кожны ў сябе ў краіне рэпрэзентатыўнае апытанне па падобнай метадалогіі і папярэдне ўзгодненым інструментарыі (анкеце).

**Па матэрыялах БелТА.**

МЕРКАВАННІ

# «ЛЮДЗІ НЕ ПРОСТА НАСТРОЕНЫ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ВЫБАРАХ — ЯНЫ ВЫБАРЫ ЧАКАЮЦЬ»

## Парламентарыі — аб высокай электаральнай актыўнасці беларусаў



**Аляксандр БАГЕЛЬ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, дырэктар ААТ «Світанак» імя К. П. Арлоўскага»:**

— Ад кожнага з нас залежыць, як мы будзем жыць у будучыні, і людзі гэта разумеюць. Радуе, што нашы людзі салідарныя ў гэтых думках. На іх вачах за 30 гадоў адбыўся імклівы рух наперад. Мы будуем дарогі, жыллё, сучасныя аўтаматызаваныя фермы, асвойваем перадавыя тэхналогіі і робім свае адкрыцці. І не збіраемся прыпыняцца на дасягнутым.

Не сумняваюся, што народ зробіць правільны выбар. Падчас сустрэч з людзьмі я часта чую словы падзякі ў адрас кіраўніцтва дзяржавы за стабільнасць, мір, устойлівае развіццё эканомікі. Беларусы задаволены якасцю свайго жыцця, разумеюць усю крохкасць гэтага свету, занепакоеныя тымі падзеямі, якія адбываюцца вакол краіны. Яны хочуць, каб іх дзеці і ўнукі жылі ў квітнеючай краіне. Сельская гаспадарка, дзе я доўгі час працую, пастаянна адчувае на сабе дапамогу з боку дзяржавы. Перакананы, што так будзе і ў далейшым. І наш аграпрамысловы комплекс гатовы і надалей рабіць унёсак у харчовую бяспеку нашай краіны.

Ад нас залежыць, як мы будзем жыць далей. Трэба самааддана працаваць, выхоўваць дзяцей, не забываць нашых герaічных продкаў. Нашчадкі пераможцаў павінны з гонарам несці гэта званне. Наша моц у адзінстве, справядлівасці і перакананасці ў тым, што мы знаходзімся на адзіна правільным шляху развіцця краіны.



**Ірына ДАЎГАЛА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў:**

— Сёння наўрад ці знойдзецца чалавек у нашай краіне, які не ведаў бы пра тое, што ў нас ідзе самая важная палітычная электаральная кампанія — выбары Прэзідэнта Беларусі. Вядома ж, акрамя інфармацыйнага забеспячэння ўсімі відамі сродкаў масавай інфармацыі, інтэрнэт-рэсурсамі, сацыяльнымі сеткамі, ідуць сустрэчы ў працоўных калектывах, з насельніцтвам па месцы жыхарства дэпутатамі ўсіх узроўняў, прадстаўнікамі дзяржаўных органаў.

Жывыя зносіны з людзьмі — гэта заўсёды як глыток паветра. Яны хітраваць не будуць, проста і даходліва скажуць, што добра, а што, мякка скажам, не вельмі. Таму падчас сустрэч яскрава відаць, што людзі не проста настроены ўдзельнічаць у выбарах — яны выбары чакаюць. На адным з участкаў маладыя выбаршчыкі заявілі, што «галасаваць прыйдзем датэрмінова, а ў дзень выбараў таксама прыйдзем, бо на нашым участку заўсёды класная праграма, так што ўсёй сям'ёй на выбары». І такі настрой адчуваецца практычна ўсюды.

Краіна ў чаканні галоўнай палітычнай падзеі, якая, без усялякіх сумненняў, пройдзе зладжана, арганізавана і, галоўнае, у адпаведнасці з заканадаўствам.



**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы і культуры Палаты прадстаўнікоў:**

— Жаданне грамадзян Рэспублікі Беларусь браць актыўны ўдзел у галасаванні на прэзідэнцкіх выбарах сведчыць аб падтрымцы палітычнага курсу дзеючай улады, аб разуменні адказнасці кожнага з нас за лёс нашай краіны, за захаванне міру і спакою ў ёй, за захаванне суверэнітэту беларускай дзяржавы. Упэўнены, што беларусы на прыкладзе іншых краін ва ўмовах геапалітычнага «шторму» пераканаліся, наколькі важная роля нацыянальнага лідара, яго здольнасць адстойваць інтарэсы народа, забяспечваць эфектыўнае функцыянаванне дзяржаўнага апарату і эканомікі. Сёння як ніколі раней усе мы выдатна разумеем каштоўнасць міру, спакою і суверэнітэту. Гэтых рэчаў вельмі цяжка дасягнуць, але іх вельмі лёгка страціць.